***Антановіч Н. М.***, *дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Шырко А. С.***, *выкладчык-стажор, магістрант кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі.*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка*

# Уладзімір Караткевіч — дзецям

## Урок пазакласнага чытання ў II (III) класе

***Мэты:***

• пазнаёміць з некаторымі фактамі з жыцця і творчасці У. С. Караткевіча; з казкай У. С. Караткевіча «Вясна ўвосень»;

• удасканальваць навык свядомага, правільнага, выразнага чытання; развіваць чытацкія ўменні (устанаўліваць сэнсавыя сувязі паміж падзеямі; знаходзіць і вылучаць патрэбную інфармацыю з тэксту; аналізаваць учынкі герояў; характарызаваць герояў на падставе іх паводзін; выражаць свае адносіны да прачытанага, учынкаў герояў);

• развіваць звязнае вуснае маўленне, лагічнае мысленне, фантазію вучняў;

• выхоўваць кемлівасць, уважлівасць, цікавасць да навакольнага асяроддзя.

***Абсталяванне:*** партрэт У. С. Караткевіча, кнігі У. С. Караткевіча з творамі для дзяцей розных гадоў выдання; камп'ютар (планшэт) з доступам у інтэрнэт; тлумачальны слоўнік; карта Рэспублікі Беларусь; кінахлапушка з кадрамі; карткі з заданнямі для кожнага вучня да твора «Белавежская пушча».

**Спіс кніг, рэкамендаваных для кніжнай выставы**

Караткевіч, У. С. Белавежская пушча: Нарыс : для дзяцей дашк. і мал. шк. узросту / У. С. Караткевіч. — Мінск : Юнацтва, 1997. — 16 с.

Караткевіч, У. С. Жабкі і Чарапаха: казкі / У. С. Караткевіч. — Мінск : Мастацкая літ., 2018. — 24 с.

Караткевіч, У. С. Казкі : для мал. шк. узросту / У. С. Караткевіч ; маст. Н. Табушава. — Мінск : Бел. Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2020. — 32 с.

Караткевіч, У. С. Кацёл з каменьчыкамі: казкі / У. С. Караткевіч. — Мінск : Бел. Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2013. — 56 с.

Караткевіч, У. С. Лебядзіны скіт: казкі / У. С. Караткевіч ; маст. М. Купава. — Мінск : Мастацкая літ., 2020. — 110 с.

Караткевіч, У. С. Старая казка: казкі / У. С. Караткевіч ; маст. Л. Пастушэнка. — Мінск : Нар. асвета, 2020. — 56 с.

Караткевіч, У. С. Чортаў скарб: казка : для дашк. і мал. шк. узросту / У. С. Караткевіч. — Мінск : Белая Русь, 1993. — 20 с.

**I. Арганізацыйны этап.**

— Добры дзень, паважаныя сябры! Наш урок пазакласнага чытання будзе прысвечаны творчасці вядомага беларускага пісьменніка. Паглядзіце на партрэт на дошцы. Ці ведаеце вы, хто гэта?

— Гэты чалавек — Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч. Прапаную разгледзець яго партрэт.

— Паглядзіце на вочы Уладзіміра Караткевіча. Які позірк у гэтага чалавека: добры ці злы, зацікаўлены ці пусты, вясёлы ці сумны?

— Разгледзьце вусны. Ці ёсць на іх усмешка?

— Як вам здаецца, якім чалавекам быў Уладзімір Караткевіч? (Выслухоўваюцца разважанні вучняў.)

— Уладзімір Караткевіч быў не толькі пісьменнікам, але і сцэнарыстам. Як вы разумееце гэта слова? Я прапаную знайсці значэнне гэта слова ў тлумачальным слоўніку.

— Як мы будзем шукаць патрэбнае слова? *(Словы ў слоўніку размешчаны ў алфавітным парадку.)*

— Сцэнарыст — гэта чалавек, які піша сцэнарыі. Уладзімір Караткевіч шмат зрабіў для беларускага кінематографа, напісаў сцэнарыі дакументальных фільмаў.

**II. Этап знаёмства з жыццём і творчасцю У. С. Караткевіча.**

— На ўроку мы таксама ператворымся ў сцэнарыстаў і створым фільм пра наш урок пазакласнага чытання. Згодныя? Пачынаем!

Адзін з вучняў трымае «хлапушку» (мал. 1).




*Малюнак 1*

***Кадр 1.* «Пра Уладзіміра Караткевіча».** (Назвы кадраў вывешваюцца на дошцы.)

— Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч — класік беларускай літаратуры, паэт, празаік, кінасцэнарыст, публіцыст, перакладчык. Паслухаем, якія паведамленні пра жыццё і творчасць Уладзіміра Караткевіча падрыхтавалі вашы аднакласнікі.

Выступленне першага вучня.

— Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч нарадзіўся 26 лістапада 1930 г. у г. Оршы Віцебскай вобласці. У сям'і было трое дзяцей: старэйшы брат Валерый, старэйшая сястра Наталля і Уладзімір.

Вялікі ўплыў на Уладзіміра аказаў дзед Васіль Юллянавіч Грынкевіч. Менавіта ад яго хлопчык пачуў шмат казак і народных паданняў, пераняў любоў да прыроды. У доме бацькоў была свая хатняя бібліятэка. Валодзя ў дзяцінстве не толькі любіў слухаць казкі і розныя гісторыі, якія яму чыталі старэйшыя, але імкнуўся дадумваць развіццё сюжэтаў. Хлопчык у 3,5 гады навучыўся чытаць, стаў актыўным наведвальнікам гарадской дзіцячай бібліятэкі. У 6 гадоў ён напісаў першыя вершы.

У дзіцячыя гады ў Валодзі выявілася схільнасці да малявання, якая захавалася на ўсё жыццё. Таксама ён меў абсалютны слых, добра спяваў, ведаў многа беларускіх народных песень. Некаторы час займаўся ў музычнай школе.

Выступленне другога вучня.

— У час вучобы ў старшых класах Уладзімір пісаў апавяданні, літаратуразнаўчыя артыкулы. Паводле яго слоў, стварыў не менш за 200 вершаў, але спачатку нікому іх не паказваў. Настаўніца, кіраўніца школьнага літаратурнага гуртка, падтрымала юнага паэта. Яго вершы, прыгодніцкая аповесць «Загадка Неферціці», а таксама ўласнаручныя ілюстрацыі да іх з'явіліся ў рукапісным часопісе «Званочак».

Займаўся Уладзімір Сямёнавіч і перакладамі з іншых моў: латышскай, літоўскай, грузінскай, украінскай, рускай, польскай, славацкай, чэшскай, туркменскай.

— Уладзімір Сямёнавіч напісаў шмат кніг для дарослых, ёсць у яго творы і для дзяцей. Зараз мы пазнаёмімся з некаторымі з іх.

Адзін з вучняў трымае наступную «хлапушку».

***Кадр 2. «Кнігі Уладзіміра Караткевіча для дзяцей».***

Вучні разглядаюць кнігі Уладзіміра Караткевіча, прадстаўленыя на кніжнай выставе (мал. 2).




*Малюнак 2*

— З якім творам Уладзіміра Сямёнавіча вы знаёміліся дома? *(«Белавежская пушча».)*

Адзін з вучняў трымае наступную «хлапушку».

***Кадр 3.* «Уладзімір Караткевіч “Белавежская пушча”».**

— Ці спадабаўся вам гэты твор? Чым?

— На картцы вам прапануюцца заданні для самастойнай работы.

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнямі (*дадатак 1*).

Калектыўная праверка выкананых заданняў.

— Якую ролю выконвала Белавежская пушча ў даўнія часы? Знайдзіце адказ у тэксце. Прачытайце. *(«З даўніх, вельмі даўніх часоў Пушча была аплотам нашых продкаў, надзейным прытулкам у цяжкія гады. Яна карміла і паіла, гартавала мужнасць і сілу людзей»* [1, с. 5].*)*

— Як людзі паводзілі сябе ў Пушчы раней, а як — зараз?

— Ці ведаеце вы, дзе знаходзіцца Белавежская пушча? *(На захадзе Беларусі, на мяжы з Польшчай.)* (Настаўнік паказвае на карце месца знаходжання Белавежскай пушчы.)

— Хто з вас быў у Белавежскай пушчы? Што вам запомнілася? Раскажыце, якіх жывёл бачылі.

Адзін з вучняў трымае наступную «хлапушку».

***Кадр 4.* «Прэзентацыя кнігі “Казкі”».**

— Пераходзім да наступнага кадра.

Настаўнік дэманструе кнігу «Казкі» (мал. 3) [2].




*Малюнак 3*

— Як вы думаеце, пра што будзе гэты кадр? Давайце даведаемся.

— У 2020 г. з нагоды 90-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча ў выдавецтве

«Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» выйшла кніга «Казкі». У яе ўвайшлі тры казкі славутага пісьменніка. Прачытайце якія. *(«Верабей, сава і птушыны суд», «Кацёл з каменьчыкамі», «Вясна ўвосень».)*

— Казкі былі напісаны шмат гадоў таму, але іх змест і сёння застаецца актуальным, таму што закранутыя ў іх тэмы — вечныя. Разам з героямі казак маленькія і дарослыя чытачы вучацца спагадзе, дабрыні, шчырасці і сумленню.

— Малюнкі да кнігі зрабіла Наталля Табушава. Разгледзьце іх.

— Сёння мы пазнаёмімся з адной казкай з гэтай кнігі. Адгадайце загадкі, якія падкажуць вам назву казкі.

Глянь: у небе клін жывы —
Гэта з поўдня журавы
Без спачыну і без сну
Нам нясуць красу-... (*вясну*).

*В. Кажура* [3, с. 27]

Нібы казачныя сны,
Ткала ... (*восень*) дываны:
У іх мятны водар лета
І краса апошніх кветак.

*В. Кажура* [3, с. 29]

— Як вы думаеце, з якой казкай мы пазнаёмімся? *(«Вясна ўвосень».)*

Адзін з вучняў трымае наступную «хлапушку».

***Кадр 5.* «Уладзімір Караткевіч “Вясна ўвосень”».**

— Паразважайце, чаму твор мае такую назву. Ці можа быць вясна ўвосень?

— Якія малюнкі вы ўявілі, калі пачулі назву твора?

***Чытанне казкі «Вясна ўвосень» настаўнікам.***

— Які настрой выклікала ў вас казка?

— Хто з'яўляецца галоўнымі героямі казкі «Вясна ўвосень»?

***Чытанне казкі вучнямі ланцужком.***

***Аналіз зместу твора.***

— Што з'яўляецца доказам таго, што Янка цяжка захварэў?

— Што хацеў убачыць хлопчык? Як вы думаеце чаму?

— Як аўтар апісвае надвор'е на вуліцы? Раскажыце, што вы ўявілі.

— Якія словы ў тэксце пацвярджаюць, што Аленка перажывала за брацiка?

— Да каго па дапамогу звярнулася дзяўчынка? Ці адразу Сонейка пагадзілася паказацца?

— Ці захацелі звяры дапамагчы Янку? Чаму?

— Як хлопчык дапамагаў зімой сінічкам, шчыглам? Пра што гэта сведчыць?

— Чаму Сонейка вырашыла ўсё ж такі паказаць свае прамяні? На каго яму было цікава паглядзець?

— Што і хто ўзрадаваўся з'яўленню Сонейка? Знайдзіце і прачытайце ў тэксце.

— Якія падарункі падрыхтавалі для Янкі звяры: заяц, рыбкі, вавёркі, рак? Як бы вы ахарактарызавалі звяроў?

— Чаму Аленка расплакалася?

— Як бы вы ахарактарызавалі Аленку? Ці хацелі б вы, каб у вас была такая сястрычка? Чаму?

— Якія словы з тэксту пацвярджаюць, што хлопчык стаў адчуваць сябе лепш?

— Разгледзьце малюнкі ў кнізе. Да якіх урыўкаў яны адносяцца? Раскажыце.

***Абагульняльная гутарка.***

— Чаму звяры і Сонейка прыйшлі на дапамогу хлопчыку? Які працяг гэтай казкі прыдумалі б вы?

— Чаму гэты твор з'яўляецца казкай? Чаму казка мае такую назву? Якія малюнкі да казкі намалявалі б вы?

**III. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Мы зрабілі з вамі пяць цікавых кадраў (мал. 4). Паглядзіце на іх.

— Давайце падагулім нашу працу і падвядзём вынікі.

— Калі і дзе нарадзіўся Уладзімір Караткевіч?

— Хто з родных аказаў вялікі ўплыў на творчасць Уладзіміра Караткевіча?

— Кім па прафесіі быў Уладзімір Сямёнавіч?

— Якія творы Уладзіміра Караткевіча мы чыталі і аналізавалі на ўроку?

— Чаму вучаць творы Уладзіміра Сямёнавіча?

**IV. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

— Прапаную вам выканаць дома творчае заданне. Падрыхтуйце малюнкі да казкі «Вясна ўвосень». Падумайце, пра што можа быць казка, якая мае назву «Зіма ўлетку»?

— Дзякуй за ўрок. Да новых сустрэч!




*Малюнак 4*

*Дадатак*

**Заданні для самастойнай работы**
**Уладзімір Караткевіч «Белавежская пушча»**

1. Якое значэнне мае слова *пушча*? Адзначце адказ знакам «✓».
☐ вялікі лес
☐ пустое месца
☐ лес, у якім шмат жывёл

2. Адзначце знакам «✓» назвы жывёл, якія **не** ўзгадваюцца ў творы.

| | | |
|---|---|---|
| ☐ воўк | ☐ алень | ☐ лось |
| ☐ зубр | ☐ дзік | ☐ лань |
| ☐ ліса | ☐ мядзведзь | ☐ рысь |

3. Суаднясіце назвы жывёл з іх фотаздымкамі. Перайдзіце па QR-кодзе і выканайце заданне.

4. Адзначце знакам «✓» фотаздымак, на якім адлюстраваны самы вялікі і дужы звер у Белавежскай пушчы.


☐


☐


☐

Знайдзіце і прачытайце (падкрэсліце) у тэксце словы, якія гэта пацвярджаюць.

5. Колькі відаў птушак у Белавежскай пушчы? Адзначце адказ знакам «✓».

| | |
|---|---|
| ☐ больш за 200 | ☐ больш за 2 000 |
| ☐ больш за 20 | ☐ больш за 100 |

6. Якая птушка славіцца сваімі спевамі? Адзначце адказ знакам «✓».

| | |
|---|---|
| ☐ сава | ☐ салавей |
| ☐ чорны бусел | ☐ цецярук |
| ☐ шпак | |

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Караткевіч, У. С.* Белавежская пушча: нарыс : для дзяцей дашк. і мал. шк. узросту / У. С. Караткевіч. — Мінск : Юнацтва, 1997. — 16 с.
2. *Караткевіч, У. С.* Казкі : для мал. шк. узросту / У. С. Караткевіч ; маст. Н. Табушава. — Мінск : Бел. Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2020. — 32 с.
3. *Кажура, В. В.* Пакацілася сонейка... Вершы і загадкі пра месяцы года : для мал. шк. узросту / В. В. Кажура. — Мінск : Бел. Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2020. — 32 с.






## ЭЛЕКТРОННОЕ ПРИЛОЖЕНИЕ К ЖУРНАЛУ

С 1-го полугодия 2019 г. электронное приложение к журналу ежемесячно размещается на сайте (www.aiv.by). Приобрести его можно по безналичному расчёту, цена приложения — 1 руб.

Для получения электронного приложения необходимо зайти на сайт издательства **www.aiv.by** и действовать в следующем порядке:

**Журналы → Электронные приложения → «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа» →** выбрать необходимый номер журнала **→ Купить → Оформление заказа →** далее действовать согласно указаниям.

После **Оплаты банковской картой онлайн** или через **Расчёт ЕРИП** читателю будет выслан по электронной почте доступ к электронному приложению.